2022-02-275

# Эканамічная гісторыя Барысаўскага рэгёна і горада Барысава

## (з найстаражытных часоў да сучаснасці)

*(Працяг, пачатак у №10-12 (175-177) за 2013 г., 1-12(178-189) за 2014 г. і 1-12(191-201) за 2015 г., 1-9(202-211) за 2016 г., 1-2(214-215), 4-12(217-225) за 2017 г., 1-11(226-236) за 2018 г., 1-2(238-239), 4-8(241-245), 10-12(247-249) за 2019 г., 1-2(250-251), 4-12(253-261) за 2020 г., 1(262), 3(264), 6-10(2678-271) за 2021 г.)*

Тэма адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення ў БССР другой паловы 1920-х г.г. часткова закранался ў адной з папярэдніх публікацый. У прыватнасці, паднімалася пытанне аб неабходнасці вывучэння Барысаўшчыны ў сучасных межах, якія сфармаваліся параўнальна нядаўна. Зараз падрабязней разгледзім хроніку падзей і змены, што адбыліся пасля ліквідацыі Барысаўскай акругі, якая ўзнікла ў 1924 г. і памерам падобна з адначасова ліквідаваным аднайменным паветам.

Рашэнне пра скасаванне было прынята на VIII Усебеларускім з'ездзе Саветаў. У пастанове ад 12 красавіка 1927 г. гаварылася: "Прымаючы да ўвагі ўзмацненне фінансавання народнай гаспадаркі, варта праводзіць мерапрыемствы па памяншэнні выдаткаў на ўтрыманне кіроўнага і рэгулюючага апаратаў. У прыватнасці, для скарачэння выдаткаў на ўтрыманне акруг і ў сувязі з перанясеннем цэнтра ўвагі на нізавыя савецкія органы, з'езд прызнае мэтазгодным павялічыць акругі, для чаго ліквідаваць Барысаўскую, Слуцкую, Калінінскую і Рэчыцкую акругі, прычым Барысаўскі, Слуцкі, Калінінскі і Рэчыцкі гарадскія Саветы павінны быць непасрэдна падпарадкаваныя акруговым выканаўчым камітэтам...".Такім чынам, з пункта гледжання эканамічнага, культурнага і адміністрацыйнага складнікаў існаванне ўказаных акруг палічылі немэтазгодным. Мэта абвяшчалася як быццам бы добрая – аптымізаваўшы апарат вышэйстаячых кіроўных структур, умацаваць "нізавыя савецкія органы", гэта значыць, раённыя звёны, а сродкі, якія вызваляліся, накіраваць на фінансаванне эканомікі, якая стала на шлях індустрыялізацыі. За кошт скасаваных тэрытарыяльных утварэнняў планавалася ўмацаванне суседніх акруг, да якіх пераходзілі кіроўныя функцыі над ізноў уключанымі раёнамі, што адпаведна цягнула… павелічэнне адміністрацыйна-кіроўнага апарата.

9 чэрвеня таго ж года выйшла пастанова ЦВК і СНК БССР "Аб размеркаванні тэрыторый Барысаўскай, Слуцкай, Калінінскай і Рэчыцкай акруг паміж іншымі акругамі БССР": "VIII Усебеларускі з'езд Саветаў у мэтах умацавання (фінансавання) народнай гаспадаркі і памяншэння выдаткаў на ўтрыманне адміністрацыйнага апарата, 12 красавіка 1927 г. па дакладзе ўрада БССР… пастанавіў ліквідаваць Барысаўскую, Слуцкую, Калінінскую і Рэчыцкую акругі". У той жа пастанове канкрэтызаваўся тэрытарыяльны падзел. Землі Барысаўскай акругі размяркоўваліся наступным чынам: "...Бярэзінскі, Бягомльскі, Зембінскі, Плешчаніцкі, Халопеніцкі, Крупскі і Барысаўскі р-ны ў існуючых межах з г. Барысаў далучыць да Менскай акругі; Лепельскі р-н у існуючых межах далучыць да Полацкай акругі; Чарэйскі р-н у існуючых межах далучыць да Аршанскай акругі".- Такім чынам, Барысаўскі раён і яго цэнтр горад Барысаў перападпарадкоўваўся акруговым уладам у Менску. Аналагічна быў перадпарадкаваны Зембінскі раён.

Да 15 чэрвеня патрабавалася канчаткова размеркаваць тэрыторыі, вырашыць пытанні з маёмасцю, фінансамі і іншае. Гэтая задача ўскладалася на спецыяльныя ліквідацыйныя камісіі, якія складаюцца з прадстаўнікоў "як ліквідаваных, так і зацікаўленых акруговых выканаўчых камітэтаў". У нашым выпадку – па адным прадстаўніку ад Барысаўскай і Менскай акруг. Персанальны склад камісій зацвярджаўся ўрадам. Пры ўзнікненні спрэчных і іншых пытанняў члены камісій кіраваліся спецыяльна выдадзенай інструкцыяй, падрыхтаванай народным камісарыятам унутраных спраў (НКУС) сумесна з народным камісарыятам фінансаў і зацверджанай Эканамічнай нарадай БССР. Апошнім тэрмінам дзейнасці ліквідацыйных камісій было прызначана 1 ліпеня. Характэрна, што нагляд за ажыццяўленнем усіх мерапрыемстваў ускладаўся… на органы НКУС (???).

Але якая падзея папярэднічала ліквідацыі пералічаных акруг? Звернемся да снежня 1926 г., калі ЦВК і СНК БССР прынялі пастановы "Аб далучэнні да БССР Рэчыцкага і Гомельскага паветаў былой Гомельскай губерні РСФСР". У гісторыю нашай краіны гэтае ўз'яднанне ўвайшло як другое ўзбуйненне Беларускай ССР (першае адбылося ў 1924),якое стала значнай вяхой у палітычным, эканамічным і культурным жыцці рэспублікі 1920-х г.г. У выніку тэрыторыя павялічылася на 15 тыс.727 кв. км., а насельніцтва ўзрасло на 649 тыс. чалавек.

Вяртаемся да Барысаўскага раёна. Да восені 1927 г. у яго складзе знаходзілася 16 сельсаветаў – Вяліканегнавіцкі, Вялікастахаўскі, Бродаўскі, Бытчанскі, Вяляціцкі, Глівінскі, Жыцькаўскі, Забашавіцкі, Зачысценскі, Лошніцкі, Мётчанскі, Неманіцкі, Навасёлкаўскі, Аздзяціцкі, Перасадскі, Чарневіцкі.

Найбуйным з суседніх раёнаў з'яўляўся Зембінскі, які складаецца з 10 сельсаветаў – Ганцавіцкі, Гарэла-Лужскі (пазней Іканскі), Зембінскі, Каменскі, Кішчына-Слабодскі, Карсакавіцкі, Касцюкоўскі (Касцюковіцкі), Мсціжскі, Швабскі і Хаўхоліцкі. Да ўвагі, у кастрычніку 1924 – траўні 1928 г. у Хаўхоліцкім сельсавеце старшынёй быў выхадзец з барысаўскай вёскі Рагатка Дзмітрый Сцяпанавіч Малчанскі (1901-1979), у будучым вядомы дзяржаўны і грамадскі дзеяч БССР. Адзначым, што Кішчына-Слабодскі і Хаўхоліцкі сельсаветы да 21 жніўня 1925 г. лічыліся за Барысаўскім раёнам, а затым былі перададзеныя Зембінскаму. У якасці асобнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі раён праіснаваў тры гады ў складзе Барысаўскай і каля трох месяцаў – Менскай акруг. Гісторыя Зембінскага раёна (дарэчы, практычна не вывучаная) абрываецца на даце 22 верасня 1927 г. У той дзень ЦВК і СНК БССР прынялі чарговую пастанову "Аб ліквідацыі Зембінскага р-на Менскай акругі і размеркаванні тэрыторыі сельскіх Саветаў Зембінскага р-на паміж Барысаўскім, Плешчаніцкім, Бягомльскім і Лагойскім р-мі".

У выніку, плошча Барысаўшчыны аднамаментна ўзрасла. Акрамя вернутага Кішчына-Слабодскага і Хаўхоліцкага сельсаветаў, раён папоўніўся Зембінскім, Карсакавіцкім і Касцюкоўскім (Касцюковіцкім) сельсаветамі. Тым не менш частка паўночна-ўсходніх зямель краю ў яго сучасных межах па-ранейшаму належала суседзям. Так, Ганцавіцкі сельсавет адышоў Плешчаніцкаму, а Іканскі і Мсціжскі ўліліся ў склад Бягомльскага раёна. Уз'яднанне ўказаных сельсаветаў з нашым рэгёнам адбылося ў пасляваенны час.

*(Працяг будзе)*

***Аляксандр Балябін,***
*гісторык-археограф ДУК "Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева"*